ПАГАДНЕННЕ
ПАМІЖ МІНІСТЭРСТВАМ ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
І МІНІСТЭРСТВАМ ЗЯМЕЛЬНАЙ ГАСПАДАРКІ СЛАВАЦКАЙ РЭСПУБЛІКІ
АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ Ў ГАЛІНЕ ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРКІ*

______________________________
*Уступіла ў сілу 15 снежня 2000 г.

Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства зямельнай гаспадаркі Славацкай Рэспублікі, якія далей называюцца "Бакі",

выказваючы намер паслядоўна і на доўгатэрміновай аснове развіваць двухбаковае супрацоўніцтва ў галіне лясной гаспадаркі,

пагадзіліся аб наступным:

Артыкул 1

Бакі будуць ажыццяўляць супрацоўніцтва ў галіне лясной гаспадаркі на аснове раўнапраўя і ўзаемнай карысці ў адпаведнасці з дзеючымі заканадаўствамі дзяржаў Бакоў.

Артыкул 2

1. Узаемнае супрацоўніцтва паміж Бакамі будзе ажыццяўляцца па наступных накірунках:

а) адміністрацыйныя, прававыя і эканамічныя аспекты кіравання лясамі;
б) шматфункцыянальнае выкарыстанне і ўзмацненне экалагічных функцый лясоў;
в) захаванне генетычнага фонду і біялагічнай разнастайнасці лясной раслiннасці;
г) узнаўленне лясоў;
д) ахова лясоў ад пажараў;
е) абарона лясоў ад шкоднікаў і хвароб;
ж) вядзенне паляўнічай гаспадаркі;
з) арганізацыя лясаўладкавання;
і) маніторынг лясоў.

2. Іншыя накірункі супрацоўніцтва могуць быць уключаны ў данае Пагадненне па ўзаемнай дамоўленасці Бакоў.

## Артыкул 3

1. Супрацоўніцтва ў рамках данага Пагаднення паміж Бакамі будзе ажыццяўляцца ў наступных формах:

а) абмен вопытам работы па накірунках, указаных у артыкуле 2 данага Пагаднення, дэлегацыямі вучоных і спецыялістаў;

б) абмен навукова-тэхнічнай інфармацыяй, дакументацыяй і вынікамі навуковых даследванняў;

в) ажыццяўленне сумесных праграм і праектаў у галіне лясной гаспадаркі, а таксама правядзенне сумесных даследванняў па праблемах, якія ўяўляюць узаемны інтарэс.

2. Іншыя формы супрацоўніцтва могуць быць уключаны ў данае Пагадненне па ўзаемнай згодзе Бакоў.

## Артыкул 4

Бакі будуць садзейнічаць устанаўленню і развіццю прамых сувязяў па пытаннях лясной гаспадаркі паміж юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь і Славацкай Рэспублікі.

## Артыкул 5

Абмен навукова-тэхнічнай інфармацыяй, дакументацыяй і вынікамі навуковых даследванняў, ажыццяўленне сумесных праграм і праектаў і іншыя формы супрацоўніцтва, указаныя ў артыкулах 3 і 4 данага Пагаднення, будуць ажыццяўляцца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам дзяржаў Бакоў на ўзаемавыгаднай эквівалентнай аснове.

## Артыкул 6

3 мэтай каардынацыі работ па ажыццяўленню данага Пагаднення Бакі ў рамках дзеючага заканадаўства дзяржаў Бакоў могуць стварыць сумесную рабочую групу.

## Артыкул 7

1. Данае Пагадненне ўступае ў сілу з дня яго падпісання.

2. Данае Пагадненне заключаецца тэрмінам на 5 гадоў. Затым яго дзеянне аўтаматычна прадаўжаецца на наступны пяцігадовы перыяд, калі ніводны з Бакоў не пазней, чым за тры месяцы да заканчэння адпаведнага тэрміну не паведаміць ў пісьмовай форме другому Боку аб спыненні дзеяння данага Пагаднення.

3. Данае Пагадненне можа быць зменена або дапоўнена па ўзаемнай згодзе Бакоў. Змяненні і дапаўненні павінны быць праведзены ў пісьмовай форме.

4. Абавязацельствы ўжо выконваемыя, але к даце спынення дзеяння Пагаднення яшчэ незакончаныя, будуць кіравацца яго палажэннямі да іх поўнага выканання.

Выканана ў г.Мінску 15 снежня 2000 года ў двух сапраўдных экземплярах, кожны на беларускай і славацкай мовах, прычым абодва тэксты маюць аднолькавую сілу.

| | |
|---|---|
| За Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь | За Міністэрства зямельнай гаспадаркі Славацкай Рэспублікі |
| Подпіс | Подпіс |